**УДК 371.72**

**А. Д. Лявіцкая**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навамышскі яслі-сад», в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на*

# СІСТЭМА РАБОТЫ ВА ЎСТАНОВЕ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ ПА ЗДАРОЎЕЗБЕРАЖЭННІ І БЯСПЕЧНАЙ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯЦЕЙ

**Уводзіны.** Работа па забеспячэнні здароўезберагаючай і бяспечнай жыццядзейнасці дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі шматгранная, змястоўная. Дзейнасць педагогаў накіравана на выкананне асноўных функцый дашкольнай адукацыі: стварэнне спрыяльных умоў для жыццядзейнасці дзяцей; ахову іх жыцця і ўмацаванне здароўя; фарміраванне ў выхаванцаў асноў здаровага ладу жыцця, навыкаў бяспечных паводзін у розных сферах жыццядзейнасці (дома, на вуліцы, у дзіцячым садзе і г. д.) [1, с. 48].

Ажыццяўленне гэтай работы дазваляе ствараць умовы, неабходныя для ўсебаковага развіцця дзіцяці, гібкай адаптацыі ва ўстанове дашкольнай адукацыі, укаранення ў практыку работы аздараўленчых методык і тэхналогій, распрацоўкі гібкіх рэжымаў дня. Гэта дасягаецца шляхам рацыянальнай рэгламентацыі ўсяго адукацыйнага і выхаваўчага працэсу, аб’ёму матэрыялу, зместу дзейнасці, стварэння псіхалагічнага камфорту, развіваючага прадметна-гульнёвага асяроддзя [2].

**Асноўная частка.** Здароўезберагаючы педагагічны працэс у дзіцячым садзе — гэта працэс выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў рэжыме здароўезберажэння і здароўеўзбагачэння; працэс, накіраваны на забеспячэнне фізічнага, псіхічнага і сацыяльнага дабрабыту дзяцей.

Да асноўных напрамкаў аздараўленчай дзейнасці ва ўстанове дашкольнай адукацыі адносяцца наступныя: арганізацыя санітарна-эпідэміялагічнага рэжыму і стварэнне гігіенічных умоў жыццядзейнасці дзяцей; арганізацыя здаровага збалансаванага харчавання; забеспячэнне псіхалагічнай бяспекі дзяцей у час знаходжання іх у дзіцячым садзе; арганізацыя прафілактычнай работы з дзецьмі; фізічнае выхаванне дзяцей [3].

Захаваць і ўмацаваць здароўе дзяцей непроста. Забеспячэнне здароўя дзяцей залежыць ад стварэння здароўезберагаючай сістэмы, аптымальных умоў развіцця прадметна-гульнёвага асяроддзя. Гэта магчыма пры правільнай арганізацыі адукацыйнай, аздараўленчай і выхаваўчай работы, правядзенні прафілактычных мерапрыемстваў. Калектыў дзяржаўнай установы адукацыі «Навамышскі яслі-сад» імкнецца стварыць спрыяльныя ўмовы для здароўя і развіцця дзіцяці, зніжэння ўзроўню прастудных захворванняў. Для паспяховага рашэння гэтых задач ёсць неабходныя ўмовы: фізкультурна-музычная зала, якая забяспечана неабходным абсталяваннем; спартыўная пляцоўка; цэнтры рухальнай актыўнасці ў групах, дзе ёсць неабходны спартыўны інвентар (як традыцыйны, так і нетрадыцыйны); кабінет настаўніка-дэфектолага; кабінет педагога-псіхолага. У групах створаны камфортны, спрыяльны мікраклімат, які садзейнічае развіццю ўпэўненай у сабе асобы, устойлівай да стрэсаў, забяспечваецца атмасфера эмацыянальнага дабрабыту дзяцей. Укараненне здароўезберагаючых тэхналогій (І. У. Жытко, Дз. М. Дубініна, А. В. Гарбатава, Н. С. Старжынская, Л. С. Хадановіч, В. А. Шышкіна) дазваляе больш прадуктыўна працаваць педагагічнаму калектыву.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу педагогамі акцэнт робіцца на інтэграцыю розных відаў дзейнасці ў працэсе адукацыі і выхавання; педагогіку супрацоўніцтва ва ўзаемадзеянні з дзецьмі, што дазваляе пераадольваць стэрэатыпы вучэбна-дысцыплінарнай мадэлі адукацыйнага працэсу; скарачэнне колькасці заняткаў за кошт комплекснасці іх зместу; стварэнне развіваючага прадметна-прасторавага і сацыяльнага асяроддзя; гібкасць форм і метадаў работы выхавальніка, перавага работы з малымі групамі і індывідуальнай работы з дзецьмі, што спрыяе станаўленню іх сацыяльнага вопыту; адыход ад жорстка рэгламентаваных формаў навучання і выхавання дзяцей [4, с. 6].

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі працуе «Мацярынская школа» для дзяцей ва ўзросце ад 2 да 3 гадоў, якія не наведваюць дашкольную ўстанову. Мы надаём вялікую ўвагу рабоце з дзецьмі ў адаптацыйны перыяд, таму што гэта аказвае ўплыў на фізічнае і псіхічнае здароўе дзяцей, стараемся ствараць умовы, набліжаныя да хатніх, арганізуем аптымальны распарадак дня, праводзім кансультацыі з бацькамі па арганізацыі рэжыму дня, харчавання, адзення дзяцей. Педагогі імкнуцца забяспечыць псіхалагічны камфорт для кожнага дзіцяці з дапамогай індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі рэжымных працэсаў. У гэтым ім аказвае дапамогу педагог-псіхолаг і настаўнік-дэфектолаг, выкарыстоўваючы разнастайныя метады і формы работы [5].

Музыкатэрапія дазваляе дзецям лепш адпачыць, аднавіць сілы, палепшыць настрой. Добрая мелодыя дае дзіцяці задавальненне, запавольвае пульс, павялічвае сілу сардэчных скарачэнняў, садзейнічае паляпшэнню выканання якасці рухаў не толькі на музычных занятках, але і пры арганізацыі і правядзенні фізкультурна-аздараўленчай работы, аказвае добры ўплыў на псіхічны стан дзяцей.

© Лявіцкая А. Д., 2016



Рэпазіторый БарДУ

Казкатэрапія выкарыстоўваецца пры рабоце з дзецьмі настаўнікам-дэфектолагам. Дыхальная гімнастыка, моўныя гульні, комплексы практыкаванняў на развіццё дробнай маторыкі, гімнастыка для вачэй, фізкультхвілінкі, хвілінкі цішыні, пальчыкавая гімнастыка, псіхагімнастыка, рэлаксацыя, самамасаж — усё гэта садзейнічае якаснаму адукацыйнаму працэсу. У кожны від дзейнасці ўключаюцца практыкаванні, гульні, якія накіраваны на ўмацаванне і здароўезберажэнне дзяцей. Яны праводзяцца ў вольным тэмпе без прымусу.

На перспектыву распрацавана праграма «Здароў’е», якая дапамагае комплексна вырашаць задачы стварэння і выкарыстання сістэмы здароўезберажэння і здароўеўмацавання праз укараненне комплекснага медыка-псіхалагічнага і педагагічнага суправаджэння дзіцяці. У журнале «Маніторынг фізічнага развіцця дашкольніка» адзначаюцца захворванні кожнага дзіцяці, пропускі па хваробе, групы здароўя, распрацавана індывідуальная работа з кожным дашкольнікам у гэтым напрамку. Гэта дапамагае педагогам планаваць фізкультурна-аздараўленчую і адукацыйна-выхаваўчую дзейнасць.

Важнай неабходнай умовай для развіцця выхаванцаў, умацавання іх здароўя з’яўляецца фізкультурна-аздараўленчая работа ў дашкольнай установе, мікраклімат у групах і сумесная работа педагагічнага калектыву, медыцынскага персаналу. Фізкультурна-аздараўленчая работа праводзіцца ў адпаведнасці з нарматыўнымі актамі Рэспублікі Беларусь, рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі, Міністэрства аховы здароўя, вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Сістэматычная работа па фізічным выхаванні ўключае ў сябе штодзённую ранішнюю гімнастыку, фізкультурныя заняткі, заняткі на свежым паветры. Спартыўныя святы, забавы дапамагаюць вырашэнню задач аздараўлення дзяцей. Традыцыйныя фізкультурныя заняткі чаргуюцца з комплекснымі, сюжэтнымі, гульнёвымі, заняткамі з выкарыстаннем спартыўных комплексаў, нестандартнага абсталявання. Разнастайнасць форм фізкультурных заняткаў садзейнічае развіццю рухальнай актыўнасці дзяцей, іх індывідуальных асаблівасцей, умацаванню мускулатуры. Для кожнага выхаванца вызначана аптымальная нагрузка, прадуманы прыёмы актывізацыі мыслення і ўзаемаадносін паміж дзецьмі. Праводзіцца індывідуальная і карэкцыйная работа з дзецьмі. Вялікая ўвага надаецца прафілактыцы плоскаступовасці і фарміраванню правільнай паставы выхаванцаў. З дапамогай спецыяльных комплексаў практыкаванняў умацоўваем дыхальную сістэму, праводзім загартоўваючыя працэдуры: хадзьба басанож, паветраныя ванны ў цяні дрэў, паступовыя сонечныя ванны ў летні перыяд, сон з доступам свежага паветра; прафілактычныя, аздараўленчыя метады (паласканне рота кантраснай вадой, дыхальная і зрокавая гімнастыка). Клопату аб псіхалагічным дабрабыце выхаванцаў садзейнічаюць камфортныя бытавыя ўмовы, куткі рэлаксацыі ў групах.

Такая сістэма работы накіравана на ўмацаванне здароўя дзяцей. На працягу апошніх гадоў ідзе тэндэнцыя стабілізацыі і зніжэння колькасці прастудных захворванняў.

Арганізацыя бяспечнай жыццядзейнасці дашкольнікаў — яшчэ адзін важны аспект у выхаванні здаровага дзіцяці. Ва ўстанове дашкольнай адукацыі рэгулярна праводзіцца работа па навучанні дашкольнікаў правілам бяспекі жыццядзейнасці. Работа па выхаванні правіл бяспечных паводзін дзяцей (на вуліцах, дома, з незнаёмымі людзьмі, з жывёламі і г. д.) праводзіцца планава, сістэматычна, пастаянна. Яна ахоплівае ўсе віды дзіцячай дзейнасці з тым, каб атрыманыя тэарэтычныя веды дзіця прапускала праз прадуктыўную дзейнасць і затым рэалізоўвала ў гульнях і штодзённым жыцці за межамі дзіцячага садка.

З дашкольнікамі праводзяцца заняткі, гульні, забавы па навучанні асновам бяспечнай жыццядзейнасці. У групах абсталяваны інфармацыйныя стэнды, якія ўключаюць у сябе інфармацыю па бяспечнай жыццядзейнасці выхаванцаў, арганізуюцца выставы малюнкаў, выпуск газет.

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі пастаянна вядзецца праца па прафілактыцы траўматызму і няшчасных выпадкаў. Яна ўключае ў сябе наступныя мерапрыемствы: сістэматычны інструктаж з работнікамі па арганізацыі аховы жыцця і здароўя выхаванцаў; штодзённы кантроль бяспечнага асяроддзя знаходжання выхаванцаў у дзіцячым садзе; прафілактычную дзейнасць з бацькамі па арганізацыі бяспечнай жыццядзейнасці дзяцей за межамі ўстановы дашкольнай адукацыі; кантроль за выкананнем правіл і патрабаванняў аховы працы, пажарнай і антытэрарыстычнай бяспекі, санітарна-гігіенічных нормаў усімі супрацоўнікамі ўстановы дашкольнай адукацыі.

**Заключэнне.** Створанае здароўезберагаючае і бяспечнае асяроддзе, комплексны падыход і фізкультурна-аздараўленчая работа станоўча ўплываюць на здароўе выхаванцаў. Прымяненне ў рабоце ўстановы дашкольнай адукацыі здароўезберагаючых тэхналогій дазваляе павысіць выніковасць усяго адукацыйнага і выхаваўчага працэсу, сфарміраваць ва ўсіх удзельнікаў працэсу каштоўнасныя арыентацыі, накіраваныя на захаванне і ўмацаванне здароўя дзяцей.

Вынікі стварэння здароўезберагаючай сістэмы ва ўстанове дашкольнай адукацыі заключаюцца ў сістэматычным пошуку новых форм і метадаў работы з дзецьмі, педагогамі, бацькамі; стварэнні ў групах ўмоў для аптымізацыі дзейнасці выхаванцаў на працягу дня; умацаванні здароўя дзяцей, зніжэнні ўзроўню захворванняў, адсутнасці дзяцей з цяжкімі захворваннямі; стварэнні атмасферы псіхалагічнага камфорту ў групах, калектыве; павышэнні ўзроўню ведаў, уменняў дзяцей па арганізацыі бяспечных умоў жыцця; павышэнні інфармаванасці, зацікаўленасці і адказнасці бацькоў аб арганізацыі рацыянальнага рэжыму дня і харчавання.



Репозиторий БарГУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Лобынько Л. В., Ульянова О. А. Обеспечение здоровьесберегающего процесса воспитания и обучения детей дошкольного возраста. Минск : Зор. верас., 2006. 80 с.
2. Макаренкова Г. Г. Здоровьесберегающие системы в современном дошкольном учреждении // Пралеска. 2004. № 6.
3. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі. Мн. : Нац. ін-т адукацыі, 2012. 407 с.
4. Макаренкова Г. Г. Путь к здоровью и эмоциональному благополучию. Организация здоровьесберегающего процесса воспитания и обучения детей в дошкольных учреждениях Республики Беларусь // Пралеска. 2004. № 8.
5. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі.

Репозиторий БарГУ